View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Адамовіч Г.Я.**

## “Новая зямля” Якуба Коласа – духоўны падмурак Бацькаўшчыны

Адамовіч, Г.Я. “Новая зямля” Якуба Коласа – духоўны падмурак Бацькаўшчыны / Г.Я. Адамовіч // Каласавіны : “Зямля – аснова ўсёй айчыне” : матэрыялы XXУІІ навук. канф., прысвечанай 90-годдзю выхаду з друку паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”, Мінск, 2–3 ліст. 2013 г. / Склад.: З.М. Камароўская, Ю.В. Кішкурна. – Мінск : Ковчег, 2014. – с. 9–16.

Назва майго выступлення мае ў пэўным сэнсе правакацыйны характар, паколькі прадугледжвае два процілеглыя варыянты адказу. Правакацыйны, таму што ўзнікаюць новыя пытанні, якія пашыраюць праблемнае поле даклада, раскрываюць розныя яго аспекты, фарміруюць іншыя, дадатковыя кірункі і шляхі аналізу.

Так, ёсць два адказы на пытанне: ці з’яўляецца паэма Якуба Коласа “Новая зямля” духоўным падмуркам Бацькаўшчыны? І так, і не. Абедзве думкі могуць быць прызнаныя правільнымі. На гэта пытанне адказвалі студэнты БДПУ (19 студэнтаў) і БДАМ (22 студэнты). Іх меркаванні прыцягваюцца ў якасці адной з крыніц абгрунтавання аўтарскай ідэі. Дзве процілеглыя пазіцыі залежаць ад адказу на пытанне, якое вынікае з асноўнага: што ёсць Бацькаўшчына (са студэнцкіх работ: “ці толькі Радзіма, родная старонка, якой яна паўстае ў паэме Коласа”, “ці закладвае паэма фундаментальныя паняцці? Ці гэтыя паняцці звязаны менавіта з Бацькаўшчынай? Ці не парывае іх тлумачэнне ў паэме з родным і дарагім кожнаму?”). У выніку фармулюецца той ці іншы пункт гледжання ці варыянт адказу.

Прыгадаю шэраг меркаванняў, выказаных студэнтамі ў сваіх працах.

“Ёсць два варыянты адказу, – піша студэнт акадэміі мастацтваў. – 1. Не. Таму што ў кожнага свая Радзіма. З дзяцінства кожны бачыць яе па-рознаму… Я, напрыклад, сумую па дому, па свайму гораду, па людзях, якіх ведаю. Вось гэта і ёсць для мяне мая Радзіма. 2. Так. Таму што гэты твор напісаны да нашага пакалення, і прачытаўшы яго, я магу даведацца пра тую краіну, якая была раней. Убачыць прыгажосць, якую бачыў пісьменнік. Убачыць *яго* вачыма. Заўважыць тое, што не заўважала раней, параўнаць сучаснае і мінулае. Даведацца пра карані нашага народа, краю, айчыны”.

Даючы адказ “не, не з’яўляецца” (6 чалавек, называюць іншы твор або ўвогуле разважаюць пра неабходнасць літаратуры ў жыцці, калі пра “Новую зямлю” ў студэнта засталіся цьмяныя ўяўленні, – 15 чалавек), маладыя людзі найперш прыгадваюць сваю малую радзіму, а таксама іншыя творы беларускай і сусветнай літаратур. Таму паэма, на іх думку, выступае як адна з прыступкаў, каменьчыкаў, адна з асноў гэтага фундаменту: «Назваць “Новую зямлю” адзіным падмуркам я не бяруся. Як частка агульнага скарбу – згодна, але не на “Новай зямлі” будавалася Беларусь… у паэме паказана жыццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адной сялянскай сям'і ў яе жыццёвых клопатах і перажываннях… і гэтага літаральна мала, каб меркаваць пра Беларусь", "…магчыма, больш карэктна сказаць, што твор з'яўляецца складовай часткай (і не самай маленькай) гэтага падмурку", "…часткай падмурку беларускай культуры, складзенай са многіх выдатных твораў".

«"Новая зямля" не з'яўляецца падмуркам Бацькўшчыны. Але гэта толькі мая асабістая думка, і я нават ведаю, чаму так лічу. Я ніколі не жыла ў вёсцы, мае бабулі таксама жылі ў гарадах, таму мне не блізка вясковае асяроддзе, я не ведаю гэтага жыцця, не разумею яго, я нават думаю і размаўляю па-іншаму. Мабыць, толькі апісанні прыроды ў паэме я магу пазнаць. І тое не ўсе. Я памятаю, мне было цяжка чытаць гэты твор. Але тое было даўно, і магчыма зараз бы я ўжо па-іншаму паглядзела на паэму. Аднак твор "Сымон-музыка" я з усёй адказнасцю лічу падмуркам Бацькаўшчыны. Сымонка для мяне – гэта ўвасабленне Беларусі, Бацькаўшчыны. Лёс Сымона – гэта лёс Беларусі. Ёй не даюць рабіць тое, што хочацца: у ёй няшчаслівае каханне, яе не разумеюць, не прызнаюць, ёй час ад часу ламаюць скрыпачку. "Як то здань, а ты паслухай, ці не чуеш?.." Гэта словы пра нашу зямлю. Ці шмат з нас яшчэ чуюць яе? "Сымон-музыка" – гэта падмурак, бо праз гэты твор мы можам зразумець саміх сябе, убачыць нашыя памылкі і паспрабаваць іх выправіць» (А. Аляшкевіч).

Сярод твораў, побач з "Новай зямлёй", моладзь называе іншыя, якія ўмацоўваюць падмурак нашай Бацькаўшчыны: "Песня пра зубра" М. Гусоўскага, "Палеская хроніка" І. Мележа, а таксама "Адлёт жураўлёў" Я. Коласа («твор вельмі душэўны, мне здаецца, я бачу душу Коласа, мне становіцца лягчэй на сэрцы: "…І стаіш ты, смутны, / Доўга пазіраеш, / Як бы нешта страціў, / А што – сам не знаеш", знаходжу пачуццё роднаснай душы ў асобе Коласа»), «"Вясна" Коласа вельмі натхняе і надае веру і надзею, валодае фактычна ўратавальнымі магчымасцямі»… Твор "Спадчына": "паколькі духоўная радзіма закладваецца не толькі на творах вялікіх паэтаў, але самае галоўнае – любоў да Радзімы – закладваецца маці з нараджэннем дзіця, пачынаючы з калыханак і заканчваючы шутлівымі аповядамі дзядулі пра тое, як яны былі дзецьмі і весяліліся ў вёсцы. Падмуркам для мяне з'яўляецца тая ж самая вёска. Тая атмасфера, адносіны паміж суседзямі – вось што такое Радзіма… Чытаючы твор, я пачынаю ўспамінаць не сюжэт, але тое месца, дзе я яго чытаў, – у вёсцы. І няхай асновай любові да Радзімы стаў далёка не гэты твор, але ён стаў адным з ключавых у маім жыцці" (Р. Шыцько).

"Быў. Ёсць. Буду" Караткевіча: «У гэтым вершы і ёсць сутнасць падмурку, бо ён прасякнуты любоўю, гонарам, самаахвярнасцю. Чалавек "распяты" за ўсіх, хто жыве на гэтым свеце, за ўсіх, хто змагаецца, хто не шкадуе свайго жыцця дзеля іншых, дзеля краіны. Такі чалавек і ёсць падмурак. І так ужо хацелася б, каб такіх людзей было больш. Чым іх больш, тым грунтоўней будзе наша Бацькаўшчына" (П. Дабравольская).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Можна разглядаць Бацькаўшчыну як “месца нараджэння, сталення, як аб’ект бязмежнай любові і павагі”, як “наша мінулае, сучаснае і будучае… тое месца, куды імкнецца заўсёды душа народа”, як “пласт беларускай нацыянальнай літаратуры, што неабходны для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці” – ва ўсіх гэтых сэнсах моладзь пагаджаецца: так, «“Новая зямля” з’яўляецца душой і падмуркам, асновай культуры нашага народа. Увесь твор насычаны духам беларускага народа, любоўю да роднай зямлі… калі галоўным скарбам для людзей была зямля. Гэта і ёсць падмурак Бацькаўшчыны, падмурак існавання чалавека”, калі “з друкаваных радкоў на цябе вее подыхам мурожных траў, сагрэтай сонцам зямлі…”.

“За”, “так” выказалася па загалоўнай праблеме 20 студэнтаў.

Прапануем некаторыя ўласныя высновы, параўнаўшы твор з іншымі ўзорамі сусветнай літаратурнай спадчыны.

Знаны рускі вучоны-ўсходазнаўца М.І. Конрад называе 3 найвялікшыя творы, якімі абазначыла свой шлях сусветная цывілізацыя на пераломных пераходах свайго існавання, – “Аб Градзе Божым” Аўгусціна – у часы элінізму, “Боская камедыя” Дантэ – на пераходзе ад Сярэднявечча да Новага часу, “Маніфест” Маркса і Энгельса – ад Новага часу да Найноўшага часу [6, с. 8].

Для беларусаў у перыяд самавызначэння (“Людзьмі звацца”), самаўсведамлення сябе як нацыі, як асобнай старонкі ў сусветнай цывілізацыі такой паэмай стала “Новая зямля”.

“Боскую камедыю” Дантэ можна назваць падмуркам сусветнай цывілізацыі, гісторыі чалавецтва, убачанай праз прызму Вечнасці. Ці вытрымала чалавецтва гэты выклік, кінуты італьянцам-гуманістам? Пытанне, здаецца, рытарычнае. “Новая зямля” Якуба Коласа ў гэтым сэнсе заклала падмурак Бацькаўшчыны ў яе духоўных, пазаматэрыяльных вымярэннях.

Калі казаць пра матэрыяльныя асновы Бацькаўшчыны, яны здабыты многімі пакаленнямі працаўнікоў на беларускіх землях. Самыя розныя віды гэтай працы адлюстраваны ў творы. Невыпадкова “Новая зямля” стала энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства ў канцы XIX – пач. XX стст. Але насамрэч значэнне гэтага твора ў гісторыі Беларусі значна вышэйшае за “энцыклапедыю”. Гэта ў пэўным сэнсе – падмурак нашай духоўнасці, падмурак той ідэі, якая завецца беларускай нацыянальнай ідэяй.

Гэта краіна духу, куды вяртаецца чалавек у пошуках сваёй радзімы, “таямнічае, цудоўнае царства, у якім ён прызнаў сваю айчыну, і па ёй ужо так даўно сумавала яго сэрца, поўнае дзіўных памкненняў і прадчуванняў” [4, с. 464], краіна, куды імкнецца і нарэшце трапляе герой “Залатога гаршчка” Э.Т.А. Гофмана.

Месца “Новай зямлі” ў фарміраванні духоўнай прасторы Радзімы сапраўды незвычайнае.

Урасіма Таро (герой аднайменнай японскай казкі, запіс 8 ст.) вяртаецца да родных берагоў з краіны Дракона. Ён бачыць родныя мясціны, якія пакінуў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нібыта колькі дзён назад, аправіўшыся ў падарожжа на спіне чарапахі, але не сустракае ў вёсцы знаёмых людзей. Бацькаўшчына, “малая радзіма”, засталася тая ж. Але духоўная прастора-бацькаўшчына – людзі, асяродак – засталіся ў далёкім мінулым. Часам іх вартасць непараўнана большая для чалавека, чым матэрыяльныя рэчы навокал, чым уласная неўміручасць. Герой японскай казкі парушае табу і памірае. Героі “Брамы неўміручасці” К. Крапівы таксама пастаўлены перад выбарам, і далёка не кожны з іх вырашае развітацца са сваёй Бацькаўшчынай, з блізкімі, роднымі па духу. Духоўнае вышэй за матэрыяльнае – гэта скразная думка яднае выдатнейшыя творы сусветнай літаратуры.

Адлегласць у прасторы пераадольваюць героі вядомых аўтараў і літаратур: Бран, сын Фебала, са сваёй дружынай, Рабінзон Круза, Гулівер… І, калі казаць словамі Я. Коласа, яны бачаць, вярнуўшыся на радзіму, “той самы лес, палеткі тыя”. Але ж для ўсіх іх спраўджваецца думка беларускага песняра: “Ды людзі там жывуць другія” [5, с. 13]! Абазначаны беларускім паэтам канфлікт прасторы і Часу – адна прастора, але іншыя людзі на ёй – выяўляе сутнасць трагедыі герояў розных народаў, тлумачыць тое, пра што не сказана ў кельцкім эпасе, у японскай казцы…

Адлегласць у часе пераадолець немагчыма – ні наперад, ні назад. Можна толькі ў сімвалічным, алегарычным сэнсе адолець гэту дыстанцыю.

Французскі празаік М. Пруст акрэслівае гэты шлях у Часе: Страчаны Час вяртаецца праз мастацтва. У той жа самы перыяд, у пачатку ХХ ст., беларус Я. Колас шукаў гэты шлях – і знаходзіў яго на хвалях успамінаў. Гэты шлях не быў новым. Італьянскі гуманіст Ф. Петрарка перастварае вобраз Лаўры па ўспамінах аб ёй. Гётэ пачынае свайго “Фаўста” са звароту ў мінулае, адраджаючы яго таксама ва ўспамінах: “Што маю – мроіцца нібы здалёку, / Што страціў – тое зноў навідавоку” [3, с. 7]. Я. Колас ідзе тым жа самым шляхам неаднойчы, узнаўляючы ў душы скарб “дзянніц маіх, дзянніц маіх мінулых” [5, т. с. 291]. Вяртанне ў мінулае – асноўны кампазіцыйны прыём і ў паэме “Новая зямля”: “Цяпер разгорнем часаў шаты, / Бліжэй прыгледзімся да хаты, / Да Міхася і да Антося, / Як там вялося, як жылося” [5, с. 13].

Але не толькі аўтар вяртае час назад, каб угледзецца ў жыццё мінулых пакаленняў. Ён знаходзіць там сваю радзіму, сярод блізкіх яму людзей, якія сышлі ў нябыт, сярод бачаных некалі пабудоў, хатняй гаспадаркі, сярод тых краявідаў, што акалялі жыццё чалавека ў найшчаслівейшыя гады яго дзяцінства. І гэтае вяртанне ў мінулае “Мне душу смуткам напаўняе, / Што ў прошласць канулі гадочкі, / Мае шчаслівыя дзянёчкі, – / Прайшла, вясна ты маладая!” [5, с. 13].

Паэт аднаўляе мінулае сваё, сваёй сям’і, свайго роду.

Чытач таксама мае шмат што ў мінулым, і, як сказаў іншы класік, “Чым болей сходзіць дзён, начэй…” Чым болей гадоў вырастае за плячыма, чым болей любімых табою людзей аказваецца назаўсёды ў мінулым, тым болей позірк звяртаецца назад, тым больш шчымлівымі робяцца ўспаміны. Так, і

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

звычайны чалавек перажывае тое ж, што і лірычны герой Якуба Коласа, гэта і яго “душу смуткам напаўняе”… І так шчыміць-баліць душа за Міхала, сям’ю якога перасяляюць на новае месца…

Так, радзіма, бацькаўшчына – там, дзе застаецца наша дзяцінства, нашы дзяды і прадзеды, куды сыходзяць, сышлі і нашы бацькі і куды кіруемся мы самі. Гэта Бацькашўчына ёсць на карце кожнага з нас: Ушаччына, Стаўбцоўшчына, Случчына, Лагойшчына…

Бацькаўшчына мае найперш іншае – духоўнае – вымярэнне. І шмат у чым гэта вымярэнне пралягае праз мінулае, шчыльна злучаючы яго з сучаснасцю і будучым. Гэта яшчэ адна праекцыя Часу, якую нельга не згадаць, вымярэнне, дзе адначасова прысутнічаюць мінулае, сучаснае і будучае. А яны прысутнічаюць адначасова толькі ў душы чалавека. Толькі праз душу чалавека можа прайсці – і праходзіць – гэта вымярэнне. Вымярэнне Вечнасці. Гэта пра яе сказаў невыпадкова Барадулін, пра Бацькаўшчыну-Ушаччыну: “Яна са мной, яна ўва мне, я ў ёй таксама. Я вечны ў роднай старане, як слова – мама” [1, с. 27].

Для мяне “Новая зямля”– гэта Вяззе, дзе я нарадзілася, і пра сваё жыццё ў далёкім дзяцінстве я згадваю, чытаючы, напрыклад, пра рыбную лоўлю. Бо на маёй малой радзіме Свіслач (каля Асіповіцкай ГЭС) шырынёю паўтара кіламетры. “Новая зямля” – гэта Шэйпічы, дзе жылі бабуля з дзядулей, бацькі маёй маці: і хата, і клець, і аборы, і хлеў, і ўсё, што ў хаце… і лес, і ваколіцы – усё гэта адраджае паэма Коласа. Яна ажыўляе ў маёй душы бабулю з дзядулей, вёску Шэйпічы… “Новая зямля” – гэта Ліпень, Градзянка, Брыцалавічы, Усціж…. А з другога боку Асіповіч, ці з другога – бацькоўскага, роду маёй сям’і, – Караны, Карытнае, Забудзькі, Старае сяло… Глуша…Завалочыцы… Старыя Дарогі…

І яшчэ з адной студэнцкай работы: “Ва мностве беларускіх вершаў адчуваецца Беларусь, тая самая, родная, якой зараз так не хапае. І калі чытаеш, унутры разгортваецца такая сумота, што хочацца ліць слёзы. Душа цягнецца да сапраўднага, беларускага. А дзе яно? У кнігах, у памяці, у паветры лясоў, у зямлі.

У якіх літаратурных рэчах можна знайсці столькі болю па Бацькаўшчыне?

Боль. Імкненне да Беларусі.

“І бачу лес я каля хаты, / Дзе колісь весела дзяўчаты / Спявалі песні дружным хорам, / З работ ідучы позна борам”…

А беларусы – яны не могуць жыць без працы. Для некаторых работа – жах. Для беларускага народу, які паказвае Колас, – жыццё…

Беларускія пісьменнікі пішуць проста, бо простымі словамі можна сказаць так, што чалавечая душа назаўсёды застанецца закранутай” (Сацукевіч Ал-ра).

Увесь час шукаю тое, “от чего растет душа человека” [2, II, с. 59], тое, што “ува мне”, і што “са мной”, і ў чым “я” таксама…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэма “Новая зямля” – гэта як Гіпакрэна для старажытных грэкаў, як кубачак гарбаты ў Марселя Пруста, з якога выплыў гарадок і ўсе яго жыхары, з якога паўстала мінулае, гэта засохшая кветка ў Аляксандра Пушкіна і Максіма Багдановіча, тым, ад чаго “мечтою странной / Душа наполнилась моя” [7, с. 76]. Яна стала тым, што так ярка, так шчыра, так выразна напоўніла маю душу мінулым – яго водарам, вобразамі і што застаецца ў Вечнасці. Можа, таму так патрэбны гэты свет з яго крыніцамі і азёрамі, гэта поле, “дзе жыта хораша гайдалась, і рос авёс, ячмень і грэчка” [5, с. 13], каб усё гэта ўзяць у свае далоні і перадаць Вечнасці. Таму знішчаючы літаратуру, выкараняючы класікаў са школы, мы абрываем ніці, якія звязваюць чалавека з Вечнасцю.

Наша Бацькаўшчына вакол нас. Але самая лепшая, самая надзейная, як некрануты-незаплямлены Рай, – духоўная наша Бацькаўшчына знаходзіцца ў нашым сэрцам. І каб трапіць да яе, патрэбны нейкія сцежынкі. Адной з іх і з’яўляецца паэма “Новая зямля” Якуба Коласа.

Стоячы на Новай зямлі, далёка відаць ва ўсе бакі свету.

**Літаратура:**


1. Барадулін, Р. Вершы; “Ірве стаеннік павады…” / Р. Барадулін // Дзеяслоў
2. Багдановіч, М.А. Поўны збор твораў : у 3 т. / М.А. Багдановіч ; Акад. навук Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: В.В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 1 / рэд. А.А. Лойка. – 1992. – 751 с. ; Т. 2. – 1993. – 600 с.
3. Гётэ, Ё.В. Выбраныя творы / Ё.В. Гётэ ; уклад. Л. Баршчэўскі, П. Копанеў. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1999. – 634 с. – (Беларускі кнігазбор. Сер. 3, Замежная літаратура).
4. Гофман, Э.Т.А. Житейские воззрения кота Мурра. Повести и рассказы. Пер. с нем./ Э.Т.А. Гофман. – М. : Худож. лит., 1967. – 774 с.
5. Колас, Я. Збор твораў : у 7 т. / Я. Колас ; рэдкал.: П. Броўка [і інш.]. – Минск : Дзярж. выд-ва БССР, 1952. – 7 т.
6. Конрад, Н.И. Избранные труды: литература и театр / Н.И. Конрад ; сост. А.И. Владимирская ; отв. ред. М.Б. Храпченко.– М.: Наука, 1978.– 462 с.
7. Пушкин, А.С. Полное собрание сочинений : в 10 т. / А.С. Пушкин. – 4-е изд. – Л. : Наука, 1977–1979. – Т. 4. – 447 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ